КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 45 (1692) | 8 лістапада 2024 г.

Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Нацыянальнаму мастацкаму музею Рэспублікі Беларусь – 85!

Працяг тэмы на стар. 8—9

У аснове — інтарэсы людзей

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5 лістапада сабраў нараду па пытаннях правядзення выбараў 2025 года.

Як адзначыў Кіраўнік дзяржавы, гэта традыцыйнае мерапрыемства ў час старту электаральнай кампаніі. “Задача наша — правесці яе на высокім узроўні. Арганізацыйным перш за ўсё, — заўважыў лідар. — Мы праводзім у Беларусі перадвыбарную кампанію для свайго народа, і інтарэсы нашых людзей павінны быць пастаўлены ў аснову. А не так, як нехта хоча там за мяжой”.

Паводле слоў Прэзідэнта, перадусім неабходна стварыць належныя ўмовы для кандыдатаў і выбарчых камісій, падрыхтаваць выбарчыя ўчасткі. Таксама Аляксандр Лукашэнка нагадаў: яшчэ з савецкіх часоў у краіне прынята, што выбары — гэта свята.

— Хто б нас ні крытыкаваў, людзі прыходзяць на выбары, яны прывыклі да таго, што недзе буфет, музыка іграе і гэтак далей. Зразумела, гэта сфера адказнасці перш за ўсё нашых мясцовых органаў улады, — дадаў лідар.

Прэзідэнт выказаўся і наконт правакацый — інфармацыйных, палітычных ды іншых: “Яны былі, ёсць і будуць. Проста не трэба расслабляцца”. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што кіраўнікоў рэгіёнаў стануць рэгулярна інфармаваць аб сітуацыі, калі выявяцца якія-небудзь небяспечныя тэндэнцыі.

Гаворачы аб спробах расхістаць сітуацыю ў Беларусі, лідар паведаміў, што ўжо выпрацоўваюцца планы. У асноўным напружанне ствараецца за мяжой.

— Яны гатовы і да радыкальных дзеянняў. Значыць, і мы ў адказ павінны быць гатовы рабіць адэкватныя дзеянні, — лічыць Кіраўнік дзяржавы. — Мы вывадзі з 2020 года зрабілі. Таму будзем дзейнічаць так, як гэта патрэбна нашай краіне і нашаму народу.

Прэзідэнт падкрэсліў, што галоўная дзейная асоба ў падобны перыяд заўсёды кіраўнік ЦВК і яму належыць аказаць неабходную падтрымку.

— Я прашу арыентавацца на яго. Усё, што ён папросіць, мы павінны дапамагчы. Але там, дзе не трэба ўмешвацца, не трэба бегчы напярэдзе паравоза. У гэтым няма ніякай неабходнасці. Менш будуць нас папракаць фактычна, што мы там умешваемся ў нейкія выбары, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Як заўважыў беларускі лідар, грамадства ў нас адзінае, а эканоміка дэманструе нядрэнныя вынікі. “Але павінен вам сказаць, што будучая пяцігодка няпростая. Няпростая пяцігодка. І, магчыма, нават наступны год. Я заўсёды спрабую ўберагчы грамадства ад якіх-небудзь размоў пра санкцыі. Але іх жа ніхто не адмяняў”, — папярэдзіў Кіраўнік дзяржавы.

— Вядома, гэтыя санкцыі так ці інакш уплываюць на эканоміку. Так, мы лагістыку выбудавалі, знайшлі ў асноўным шляхі пастаўкі нашых тавараў і гэтак далей. Але цана вырасла гэтых лагістычных паставак і іншае. Таму прадпрыемствы значна былі б багацейшыя, калі б не было гэтых перашкод. Але і з гэтага будзем знаходзіць адпаведныя выйсці, — заявіў Прэзідэнт.

Галоўнае, канстатаваў ён, — арганізацыя ўнутры краіны.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

Пад увагай Першага

Сёлета адзначаецца 200-годдзе з пачатку будаўніцтва Аўгустоўскага канала. Сёння гэты ўнікальны інжынерна-тэхнічны аб'ект — адзін з самых маляўнічых пунктаў Беларусі.

Славутасць уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Сюды штогод прыязджаюць тысячы замежнікаў. Стабільна растуць эканамічныя паказчыкі мясцовых турыстычных і культурных арганізацый, удасканальваецца інфраструктура. На аб'екце ладзяцца масавыя мерапрыемствы: свята народнай творчасці “Аўгустоўскі канал запрашае сяброў”, спаборніцтвы “Нёманская вясна” і многія іншыя. І нават цяжка ўявіць, што ўсяго 20 гадоў таму тут бадай нічога не было.

Гідратэхнічныя збудаванні канала сур'ёзна пацярпелі ў выніку дзвюх сусветных войнаў. Закрытая на дзесяцігоддзі памежная зона Савецкага Саюза, па якой праходзіла рэчышча, зазнала запусценне і забыццё. Шлюзы былі разбураны, берагі зараслі чаротам, да вады падступіў лес...

Прэзідэнт Беларусі 8 студзеня 2004 года падпісаў Указ “Аб арганізацыі работ па рэканструкцыі часткі Аўгустоўскага канала”. Дакумент адводзіў на праектаванне і будаўніцтва два гады і прадугледжваў бесперабойнае фінансаванне аднаўленчага працэсу. Праз некалькі месяцаў падчас нарады па развіцці турыстычнай галіны Аляксандр Лукашэнка падкрэсліваў: гэтая ўнікальная водная сістэма павінна быць зноў задзейнічана з максімальнай карысцю для людзей. У 2005-м Кіраўнік дзяржавы аб'явіў рэканструкцыю Аўгустоўскага канала маладзёжнай будоўляй.

Дзясяткі тысяч чалавек, сотні адзінак тэхнікі, бесперапыннае фінансаванне — і выбітны помнік інжынернай думкі XIX стагоддзя ператварыўся ў сапраўдную культурна-гістарычную і турыстычную жамчужыну. Работы на Аўгустоўскім канале завяршыліся ў 2006-м. Спецыялісты аднавілі рэчышча, якое не выкарыстоўвалася з 1950-х, падмытыя і абваленыя ўчасткі, старадаўнія гідратэхнічныя збудаванні. Многія элементы рэстаўраваліся ўручную і захавалі аўтэнтычны выгляд.

Але аб'ект і цяпер застаецца ў полі зроку Прэзідэнта. Па даручэнні лідара ў 2011-м стварылі спецыяльны турысцка-рэкрэацыйны парк “Аўгустоўскі канал”. У адпаведнасці з указам Кіраўніка дзяржавы на сумежных участках канала і ракі Нёман плошчай 5749,88 гектара на 20 гадоў уведзены асаблівы прававы рэжым, што спрыяе далейшаму ўдасканаленню інфраструктуры, прыцягненню інвестыцый, павелічэнню турыстычнага патэнцыялу.

А ў 2016-м Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ “Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян”. Дакумент зацвердзіў бязвізавы ўезд у Беларусь і выезд з яе, знаходжанне ў турыстычных мэтах да пяці сутак у спецыяльным парку “Аўгустоўскі канал” і на прылеглых да яго тэрыторыях. Такім чынам, з аб'ектам звязаны першы і вельмі паспяховы досвед па прарыўным павелічэнні турыстычнага патэнцыялу нашай рэспублікі, што з часам стаў шырока вядомы як беларускі бязвіз.

Па старонках календара

■ **8 лістапада** нарадзіўся Аляксандр Сяргеевіч Бяспалы (1948—2016) — акцёр тэатра і кіно, тэатральны рэжысёр. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, уладальнік медаля Францыска Скарыны. З 1973 года працаваў на студыі “Беларусьфільм”, з 1981-га — у Тэатры-студыі кінаакцёра.

■ **10 лістапада** з'явіўся на свет Віктар Уладзіміравіч Роўда (1921—2007) — харавы дырыжор і педагог. Народны артыст БССР і СССР, лаўрэат прэміі “За духоўнае адраджэнне”, нацыянальных і міжнародных конкурсаў. Займаў пасады мастацкага кіраўніка Акадэмічнага хору Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

■ **11 лістапада** нарадзіўся Аляксандр Канстанцінавіч Ільінскі (1903—1967) — тэатральны акцёр. Народны артыст БССР і СССР, уладальнік ордэна Леніна, Сталінскай прэміі I ступені (за выкананне галоўнай ролі ў спектаклі “Несцерка” В. Вольскага). Сцэнічную дзейнасць пачаў у Мінску ў 1919-м. З 1926 года — акцёр 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа).

■ **12 лістапада** з'явіўся на свет Андрэй Ягоравіч Макаёнак (1920—1982) — драматург, сцэнарыст. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Народны пісьменнік БССР, уладальнік ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга, “Знак Пашаны”, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы за п'есу “Лявоніха на арбіце”, Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа за п'есы “Трыбунал” і “Таблетку пад язык”.

■ **13 лістапада** 1972 года — дзень нараджэння опернай спявачкі (сапрана), педагога Настассі Ігараўны Масквіной. Народная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, уладальніца медаля Францыска Скарыны. З 2002-га — салістка Вялікага тэатра Беларусі. Таксама з'яўляецца прафесарам кафедры спеваў і музычна-тэатральнага мастацтва вакальна-харавога факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Да свята

Напярэдадні 7 лістапада, калі ў Беларусі адзначаецца агульнарэспубліканскае свята, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка афіцыйна адкрыў у Мінску басейн міжнароднага стандарту.

Урачыстая цырымонія адбылася побач з будынкам басейна, узведзеным у рамках гуманітарнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. У выступленні Кіраўнік дзяржавы падзякаваў усходнім партнёрам і асабіста Сі Цзіньпіну. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: нашы народы родніць паважлівае стаўленне да гісторыі сацыялістычнага руху. Гэты дзень значны для аматараў водных відаў спорту, прафесіяналаў, заўзятараў, канстатаваў Прэзідэнт. Але істотна і тое, што цырымонія прайшла перад 7 лістапада. Беларусь адзіная на постсавецкай прасторы захавала гэты чырвоны дзень календара.

— Традыцыйна на свята мы самі робім сабе падарункі і адкрываем сацыяльна значныя аб'екты, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Па ўсёй краіне ў гэтыя дні адкрываюцца розныя аб'екты. Адзін з іх — басейн міжнароднага стандарту ў Мінску, пабудаваны кітайскім бокам.

І сапраўды, калі зазірнуць у гісторыю, пасля развалу Савецкага Саюза гэты чырвоны дзень практычна знік з календароў постсавецкіх рэспублік. Аднак Прэзідэнт Беларусі вырашыў, што нельга адмаўляцца ад святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, як і ад традыцыі ўводзіць у эксплуатацыю важныя аб'екты да 7 лістапада. Так, у 1997 годзе Аляксандр Лукашэнка ўрачыста адкрыў станцыі метро “Партызанская” і “Аўтазаводская”. А вясной 1998-га Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі афіцыйна атрымаў статус агульнарэспубліканскага свята.

Сёння можна налічыць паўтара дзясятка станцый сталічнага метро, якія ў розныя гады адчынілі дзверы для пасажыраў менавіта да Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. А яшчэ да свята адкрылі атамную электрастанцыю, установы аховы здароўя, пуцеправоды, масты і дарогі, дзіцячыя сады і арэндныя кватэры, прамысловыя прадпрыемствы і сельскагаспадарчыя комплексы... Па гэтых аб'ектах можна прасачыць прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў Беларусі, дзе галоўным заўсёды быў і застаецца чалавек.

Інвестыцыя ў якасць

“Алмаз ведаў” сустрэў 7 лістапада з абнаўленнямі. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі запусцілі мадэрнізаваную транспартную сістэму адрасная дастаўкі кніг “Тэлеліфт”.

Ва ўрачыстай цырымоніі паўдзельнічалі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч і генеральны дырэктар установы Вадзім Гігін.

Падобную сістэму мае толькі Нацыянальная бібліятэка. Дзякуючы “Тэлеліфту” літаратура з вышыннага кнігасховішча аператыўна дастаўляецца ў чытальныя залы, службова-тэхнічныя і іншыя зоны. Падчас мадэрнізацыі замянілі зношанае абсталяванне, перавялі кіраванне на новую элементную базу.

У выніку абнаўлення тэрмін эксплуатацыі “Тэлеліфта” падоўжаны на 10 гадоў. Апаратура стала больш надзейнай і эфектыўнай. Мяркуецца, што ў перспектыве мадэрнізацыя прывядзе да зніжэння выдаткаў, паскарэння дастаўкі выданняў, павышэння якасці бібліятэчных паслуг.

Масты сяброўства

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры прэзентаваў выставу “Крывёю сэрца” ва Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце ў Шанхаі.

Літаратурна-дакументальная экспазіцыя прысвечана нашым пісьменнікам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Назву выставе даў зборнік вершаў беларускіх паэтаў, што загінулі падчас ліхалецця. Сімвалічна, што замежным партнёрам праект прадэманстравалі сёлета, калі Беларусь адзначае 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

— Памяць аб вайне, гераічных подзвігах нашых суайчыннікаў на франтах і самаадданай працы ў тыле, смутак аб вялізных стратах рэспублікі духоўна аб'ядноўвае наша грамадства і з'яўляецца адным з галоўных складнікаў гістарычнай свядомасці народа, — лічыць сакуратар праекта, намеснік дырэктара музея па навуковай рабоце Алеся Кузняцова.

Выстава расказвае пра творцаў, што мужна супрацьстаялі ворагам на перадавой, змагаліся ў партызанскіх атрадах і падпольных арганізацыях, палымянымі радкамі заклікалі да абароны Радзімы. Васіль Быкаў, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка, Іван Мележ і іншыя класікі — героямі праекта сталі 19 выбітных постацей. Ваенныя старонкі іх біяграфій раскрываюць фотаздымкі, дакументы, лісты, копіі разнастайных музейных прадметаў. Акрамя таго, на банерах размешчаны QR-коды, перайшоўшы па якіх гледачы могуць праслухаць і прачытаць работы беларускіх аўтараў у перакладзе на кітайскую мову.

Экспазіцыя “Крывёю сэрца” — першае звяно ў рэалізацыі праекта “Беларусь і Кітай: літаратурны і культурны дыялог”, што ажыццяўляецца ў рамках пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэтам. Ініцыятыва ўключана ў план мерапрыемстваў па развіцці двухбаковых адносін паміж краінамі ў сферы культуры на 2024—2025 гады.

Кітайскі бок зацікаўлены ў шырокай прэзентацыі беларускай культуры. Мінск таксама з нецярпеннем чакае праектаў, прысвечаных літаратарам з Паднябеснай. Доказам таму служаць дамоўленасці аб арганізацыі абменных выстаў.

Дарэчы, музей падрыхтаваў і рускамоўную версію праекта “Крывёю сэрца”. Яго ўжо пабачылі наведвальнікі ВДНГ у Маскве. З часовай экспазіцыяй азнаёмілася больш за 50 тысяч чалавек. Чакаецца, што налета яе прэзентуюць у Пушкінскіх Гарах, а таксама ў Азербайджане.

Грандыёзна і гучна – гэта быў “Лістапад”

XXX Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад” завяршаецца. Сёння ўвечары ў Палацы Рэспублікі падвядуць яго вынікі. Але ўжо зараз можна сказаць: маштаб юбілейнага кінафоруму ўразіў.

“Кіно са знакам якасці” — так гучыць слоган сёлетняга “Лістападу”, галоўнымі тэмамі якога сталі 100-годдзе айчыннага кіно і 30-годдзе самога фестывалю. Форум разгарнуўся ў сталіцы з 1 па 8 лістапада.

— Мы пастараліся, каб нашы калегі, сябры, па-першае, пазнаёміліся з Беларуссю, паглядзелі на нашу прыгожую краіну, добрую зямлю. А па-другое, мы рыхтаваліся да мерапрыемства і з пункту гледжання сумесных праектаў, якія ўжо намецілі і паступальна будзем рэалізоўваць, — адзначыў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч на старце кінафоруму.

ПЛЁНКУ НА ПАЧАТАК

Урачыстае адкрыццё юбілейнага “Лістападу” праходзіла ў Палацы Рэспублікі, куды і прыбылі шматлікія ганаровыя госці. Сярод іх — самыя яркія зоркі айчыннай і замежнай кінаіндустрыі, а таксама творцы, што толькі пачынаюць свой шлях.

У прыемным чаканні цырымоніі прысутныя разглядалі стыльныя фотазоны ды інтэрактыўную выставу, прысвечаную гісторыі беларускага кіно. Памяць пра культавыя фільмы, што назаўжды ўвайшлі ў Залаты фонд, ажыўлялі не толькі аўтэнтычныя дэкарацыі, але і тэатральныя прадстаўленні студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Старт фестывалю даў намеснік прэм’ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка, які зачытаў віншаванне Кіраўніка дзяржавы.

— За тры дзесяцігоддзі кінафорум стаў знакавай падзеяй у культурным жыцці не толькі Беларусі, але і многіх краін блізкага і далёкага замежжа. Пашыраючы геаграфію ўдзельнікаў і адкрываючы новыя творчыя гарызонты, “Лістапад” з гонарам выконвае сваю гуманітарную місію, збліжае людзей і кантыненты, сцвярджае ідэалы міру і дабра. Упэўнены, што сёлетняе мерапрыемства, якое праводзіцца ў 100-гадовы юбілей беларускага кіно пад дэвізам “Кіно са знакам якасці”, стане месцам зараджэння культурных ініцыятыў і знаёмства з найлепшымі кінапраектамі, — гаворыцца ў адрасе.

Пасля прывітальнай прамовы Ігар Петрышэнка ўручыў спецыяльны прыз Прэзідэнта “За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве” народнаму артысту Расійскай Федэрацыі і Чачэнскай Рэспублікі Дзмітрыю Харацьяну.

— Гэты прыз — гонар для мяне. Вялікі дзякуй вашаму выбітнаму рэжысёру, народнаму артысту Віктару Тураву, які калісьці падарыў мне ролю Сцяпана Глушака ў фільме “Людзі на балоце”. Так пачалося маё сяброўства з Беларуссю і беларускім кінематографам. Яно працягваецца і зараз, — выказаў падзяку артыст.

Ганаровая місія разбіць фестывальную талерку сёлета выпала народнай артыстцы Беларусі Тамары Міронавай. Аскепкі разляцеліся пад гучныя апладысменты — значыць, кінатыдзень “Лістападу” афіцыйна стартаваў. Распачала яго беларуска-расійская стужка “Чорны замак” паводле рамана Уладзіміра Караткевіча “Чорны замак Альшанскі”.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ВЫТВОРЦАЎ

Ужо не першы год кінафестываль “Лістапад” робіцца не толькі месцам для паказу фільмаў, але і пляцоўкай для абмеркавання пытанняў далейшага развіцця сферы кінематаграфіі. У Нацыянальнай бібліятэцы 2 лістапада прайшла канферэнцыя вытворцаў кінавідэапрадукцыі “Перспектывы развіцця кінаіндустрыі на постсавецкай прасторы”.

Як адзначыў першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Грамада, Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад” ужо чацвёрты год ставіць рэкорды па колькасці пададзеных заявак на ўдзел. Летась паступіла 2087 заявак са 107 краін, сёлета — 3405 заявак са 124 краін. Па выніках работы конкурснай камісіі адабрана 130 фільмаў з больш як 40 краін. У асноўны конкурс іграваога кіно адабрана 18 фільмаў, неіграваога кіно — 12, анімацыйнага кіно — 50, кіно маладых — 11.

АМАТАРАМ ЭКЗАТЫЧНАГА КІНО

Дні нацыянальнага кіно прайшлі ў рамках XXX Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад” у кінатэатры “Перамога”. Акрамя фільмаў былі прадстаўлены экспазіцыі, прысвечаныя краінам — удзельніцам форуму. Дэманстраваліся стужкі з Індыі, Ірана, Пакістана, Узбекістана, Зімбабвэ і Рэспублікі Саха (Расійская Федэрацыя).

На Дні кітайскага кіно 1 лістапада паказалі “Бясконцае падарожжа” і “Кунг фу жарабец”. У рамках Дня кінематографа Індыі адбыўся паказ фільма “Адзін у полі воін”. На Дзень нацыянальнага кіно Ірана прадставілі карціну “Рамантыка эмада і тубы”, на Дзень кінематографа Зімбабвэ — фільм “Пабач мяне”, а 5 лістапада Пакістан прадэманстраваў карціну “Суперзорка”. У межах Дня кінематографа Узбекістана 6 лістапада ў кінатэатры “Піянер” адбыўся паказ стужкі “Шухрат Абасаў”, а ў кінатэатры “Перамога” — “Узбечка”. У гэтым жа кіназале прайшлі Дні кінематографа Рэспублікі Саха: 7 лістапада прадставілі “Легенды вечных снягоў”.

СТВАРАЦЬ РАЗАМ

Вырашаліся падчас фестывалю і задачы дзелавога супрацоўніцтва. Дзень адчыненых дзвярэй на Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” наведалі партнёры з Індыі, Ірана, Расіі, Рэспублікі Карэі.

— З дапамогай дыпламатыі адчыняем дзверы ў індыйскую, кітайскую і расійскую кінавытворчасць. Такія фестывалі, як “Лістапад”, не толькі ўмацоўваюць наша сяброўства, але і дазваляюць паказаць культуру народаў, дапамагаюць прасоўваць беларускае кіно, — адзначыў генеральны дырэктар “Беларусьфільм” Юрый Аляксей.

По выніках сустрэчы Нацыянальная кінастудыя знайшла новых партнёраў і прыйшла да пагаднення аб сумеснай кінавытворчасці з расійскім “Ленфільмам”.

— Акрамя таго, мы правялі перамовы з прадстаўніком Рэспублікі Карэя аб удзеле ў фестывалі ў наступным годзе, — расказаў Юрый Аляксей.

З МОЛАДДЗЮ НА “ТЫ”

Вырошчванне сапраўдных прафесіяналаў кінаіндустрыі — адна з прыярытэтных задач мінскага фестывалю.

— Наша моладзь павінна з першых вуснаў даведацца пра працэс кінавытворчасці, — адзначыла выканаўчы дырэктар “Лістападу” Алеся Рулькова.

Штодзень студэнты і педагогі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў наведвалі адукацыйныя і творчыя сустрэчы. Так, вопытам з беларускай аўдыторыяй падзяліліся народныя артысты Расійскай Федэрацыі Святлана Дружыніна і Анатоль Мукасей, знакамітыя рэжысёры і сцэнарысты Аляксей Аляшкоўскі, Карэн Шахназараў ды іншыя.

Адбыліся і цікавыя майстар-класы “Харэаграфія — найважнейшы элемент падрыхтоўкі сучаснага акцёра” заслужанага работніка культуры Расійскай Федэрацыі Майрбека Матаева, “Лабірынты рэжысуры” азербайджанскага рэжысёра, сцэнарыста і прадзюсара Алега Сафараліева, “Прадзюсаванне анімацыі і развіццё новых тэхналогій” генеральнага дырэктара кінастудыі “Саюзмультфільм” Барыса Машкоўцава ды многія іншыя. Важнай падзеяй стаў круглы стол “Маладому беларускаму кіно быць!”, прысвечаны праблемам студэнцкага кіно.

СВЯТА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі “Лістападзік” разгарнуўся ў кінатэатры “Піянер”.

Для гасцей зладзілі шэраг цікавых зон. Асобную прысвяцілі традыцыйнай культурнай спадчыне Беларусі. Мінскі заапарк прадставіў незвычайных птушак: палярных соў, пугача, сычоў і яркіх фазанаў.

Усе лакацыі — у гарманічным сугуччы з фільмам адкрыцця “Песня Сірын”. Па словах рэжысёра Алены Туравай, у сюжэце задзейнічаны цікавы пласт нашай старажытнай культуры, які да гэтага часу мала выкарыстоўваўся ў медыя.

— Доўгія чатыры гады вытворчасцю стужкі займалася анімацыйнае падраздзяленне кінастудыі “Беларусьфільм”. Наша каманда імкнулася стварыць фэнтэзійную гісторыю для сямейнага прагляду, каб расказаць юнаму гледачу штосьці цікавае і новае, — распавяла рэжысёр.

Карціна, дарэчы, атрымала спецыяльны прыз журы “Лістападзіка”. А пераможцам конкурсу стаў расійскі фільм “Трымайся сонца” рэжысёра Леаніда Кулібабы. Падрабязней пра вынікі трыццатага кінафестывалю раскажам у наступным нумары газеты “Культура”. Сачыце за навінамі і ў тэлеграм-канале “Культура і Мастацтва”.

Віялета ГРЫНКЕВІЧ, Антон РУДАК

Удзельнікі фестывалю

Падчас святочнага канцэрта

Госці кінафестывалю падчас цырымоніі адкрыцця

Старшыня журы асноўнага конкурсу іграваога кіно Лэй Хань:

— “Лістапад” мае вялікі ўплыў сярод міжнародных кінафестываляў. Спадзяюся, што зацікаўленасць у маштабнай культурнай падзеі з кожным годам будзе толькі расці, а партнёрства паміж краінамі-ўдзельніцамі — умацоўвацца. Менавіта на гэта накіраваны ўсе нашыя намаганні!

Член журы асноўнага конкурсу іграваога кіно Нушын Мераджы:

— На “Лістапад” прыехала другі раз! Тры гады таму я стала пераможцай конкурсу “Кіно маладых” з трагікамедыяй “Сын”. Мне вельмі падабаецца Мінск! Гэта спакойны, чысты горад.

Народная артыстка Расійскай Федэрацыі Святлана Дружыніна:

— Беларусь — краіна, дзе жывуць цудоўныя людзі. Я прыехала сюды, як у родны дом!

Член журы асноўнага конкурсу неіграваога кіно Гіві СіхаруліДзэ:

— На “Лістападзе” знаходжуся ўпершыню. Я аб’ездзіў 115 краін, і Мінск — адзін з самых любімых маіх гарадоў: утульны, чысты, з прыгожымі шырокімі вуліцамі. Тут кожны дзень праходзіць у духу шчасця і радасці!

Член журы конкурсу нацыянальных кінашкол Людміла Саянкова-Мальніцкая:

— “Лістапад” — важная частка культурнага працэсу Беларусі, што займае асаблівае месца і ў маім асабістым жыцці. Конкурс нацыянальных кінашкол уваходзіць у праграмы шматлікіх міжнародных кінафестываляў класа “А”. Ён дазваляе адкрыць новыя, аўтэнтычныя карціны.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Чжан Вэньчуань:

— Кіно — гэта мост, які дазваляе паглыбіць сяброўства народаў Беларусі і Кітая праз паразуменне. Удзел кітайскіх фільмаў у фестывалі “Лістапад” ужо стаў добрай традыцыяй.

Народны артыст Расійскай Федэрацыі, генеральны дырэктар кінаканцэрна “Масфільм” Карэн Шахназараў:

— З вялікім задавальненнем наведваю Беларусь. Апошні раз быў у Мінску і Брэсце летась, прэзентаваў сваю карціну “Хітроўка. Знак чатырох” — поўныя залы, цікавая размова з беларускімі гледачамі, якія вылучаюцца ўважлівасцю і ўдумлівасцю. Яны здольныя ацаніць добрае кіно! Таму візіт у беларускую сталіцу — падзея, якую я заўсёды чакаю.

Член журы асноўнага конкурсу іграваога кіно Кім Джын Хэ:

— На “Лістападзе” выдатная праграма. Уразілі працы з Саудаўскай Аравіі і Індыі, бо ў іх вельмі цікавы стыль. У наступным годзе планую правесці ў нашай краіне Еўразійскі кінафестываль, і я хачу выдзеліць спецыяльную секцыю для беларускага кіно.

Удзельнік асноўнага конкурсу іграваога кіно Аміт Джэйн:

— Вялікае шчасце — быць часткай гэтага маштабнага фэсту. Ад многіх сваіх сяброў чуў, што ў Беларусі і Расіі любяць кіно, знятае ў Балівудзе. А я — вялікі фанат беларускага кіно! Асабліва спадабаліся фільмы “Ідзі і глядзі” ды “Чорны замак”. У якасці жэсту падзякі прывёз сваю музычную драму “Песня кахання”. Гэта прыгожая гісторыя, у якой даследуюцца розныя адценні кахання.

Узор служэння

Урачыстае ўшанаванне народнага артыста Беларусі Ігара Алоўнікава з нагоды яго 70-годдзя адбылося 5 лістапада ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Віншаванне ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зачытаў міністр культуры Анатолій Маркевіч.

“Ваш унёсак у захаванне і развіццё традыцый беларускага акадэмічнага мастацтва — узор найвышэйшага служэння нацыянальнай культуры, а віртуознае выканальніцкае майстэрства прынесла заслужаную шчырую любоў публікі.

Вы паспяхова перадаяце свой багаты досвед таленавітай моладзі, выхоўваеце новыя пакаленні майстроў сцэны, якія з'яўляюцца асновай вядомых творчых калектываў і годна прадстаўляюць беларускае мастацтва ў свеце”, — гаворыцца ў віншаванні.

Анатолій Маркевіч таксама падкрэсліў, што жыццёвы і творчы шлях юбіляра з'яўляецца прыкладам для маладога пакалення артыстаў і ўзорам беззаветнай любові да беларускай культуры.

Ігар Алоўнікаў — прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Нарадзіўся ў 1954 годзе ў Мінску. Музычную адукацыю атрымаў у сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І. Чайкоўскага і аспірантуры Маскоўскай кансерваторыі.

Саліст Белдзяржфілармоніі з 1980-га выступае як з сольнымі фартэпіяннымі і арганнымі праграмамі, так і ў камерных ансамблях з вядомымі інструменталістамі, а таксама сімфанічным і камерным аркестрамі. Індывідуальны піяністычны стыль вызначаюць віртуозная выканальніцкая тэхніка, яркая вобразнасць, строгая архітэктоніка музычнай формы і мяккая манера інтанавання.

Больш за чвэрць стагоддзя Ігар Алоўнікаў займаецца педагагічнай дзейнасцю. З 1987-га па 1993-і ўзначальваў кафедру спецыяльнага фартэпіяна БДАМ, з 1993-га — прафесар акадэміі: сярод яго вучняў — лаўрэаты і дыпламанты міжнародных конкурсаў. З'яўляецца старшынёй журы міжнародных конкурсаў у Беларусі, уваходзіць у склад журы конкурсаў іншых краін. З 1996-га — віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі педагогаў фартэпіяна.

Ігар Алоўнікаў — аўтар шэрагу арганных і фартэпіянных транскрыпцый твораў І. Баха, І. Брамса, С. Рахманінава, П. Чайкоўскага, балетнай і аркестравай музыкі беларускіх кампазітараў. Дзякуючы эфектным віртуозным якасцям, яркай вобразнасці і зручнасці выкладу шырокае распаўсюджванне транскрыпцыі атрымалі і за мяжой. Яны пастаянна ўключаюцца піяністамі ў канцэртны і конкурсны рэпертуар, выкарыстоўваюцца ў педагагічнай практыцы.

Сапраўдныя патрыёты

У сферы культуры працуюць сапраўдныя патрыёты. Пра гэта заявіў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч на семінары для рэзерву кіруючых работнікаў галіны. Мерапрыемства адбылося на базе Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава.

Па словах міністра, беларуская культура і людзі, што ствараюць яе сваёй працай, з'яўляюцца буферам для негатыву, які спрабуюць закінуць у краіну звонку. Адмысловае месца займаюць тыя, хто гатовы ў любы момант выкарыстаць свае кіраўніцкія навыкі там, дзе яны запатрабаваныя ў найвялікай ступені. Не кожны здольны наважыцца на змену месца жыхарства, паступіцца ўласнымі інтарэсамі і камфортам дзеля справы. Але менавіта такія людзі сёння фарміруюць спецыяльную групу рэзерву кадраў Міністэрства культуры, падкрэсліў кіраўнік галіны.

Спецыяльная група рэзерву кадраў для разгляду кандыдатаў на кіруючыя пасады сфарміравана ў сакавіку ў адпаведнасці з загадам Міністэрства культуры.

У ёй — 32 рэзервісты з ліку работнікаў арганізацый сферы культуры, упраўленняў, аддзелаў, сектараў з усіх рэгіёнаў рэспублікі, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у рабоце і маюць здольнасці да кіраўніцкай дзейнасці. Сярод іх 15 кіраўнікоў, 6 намеснікаў, 11 дзяржаўных служачых і спецыялістаў.

У адкрытым дыялогу Анатолій Маркевіч падзяліўся асабістым досведам, адказаў на пытанні рэзервістаў. У прыватнасці міністр распавёў аб сваім бачанні перспектыў акадэмічнай музычнай адукацыі, нестандартных формах арганізацыі прафесійнай падрыхтоўкі па творчых спецыяльнасцях, аплаце працы кіраўнікоў і спецыялістаў сферы культуры.

Таксама падчас семінара па тэме “Аб ролі кіраўніка ў фарміраванні сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў працоўным калектыве” выступіў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін.

Аб дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь удзельнікам семінара расказала старшыня Мінскай гарадской арганізацыі РГА “Белая Русь” Наталля Воранава.

Духоўны камертон

Спектаклем “Змешаныя пачуцці” на сцэне Тэатра-студыі кінаакцёра 6 лістапада адсвяткавалі юбілей заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь, актрысы тэатра і кіно Ірыны Нарбекавай.

У 1972-м дванаццацігадовая школьніца Ірына знялася ў фільме Вячаслава Нікіфарава “Зімародак”, які стаў знакавым на яе творчым шляху. Сёння на рахунку колішняй выпускніцы акцёрскага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатра эстрады мастацкага інстытута — мноства кіна- і тэатральных роляў. Удзел Ірыны Нарбекавай у кінакарціне або спектаклі — гарантыя якасці, выканальніцкага майстэрства, прафесіяналізму, таленту, акцёрскага і чалавечага абаяння.

Лёсам артысткі стаў Тэатр-студыя кінаакцёра, на сцэне якога яна ўжо больш за 40 гадоў увасабляе найлепшыя традыцыі нацыянальнай тэатральнай школы. Яе таленту даступныя лірызм і камічнасць, эксцэнтрыка і трагедыйнасць. Сваіх гераінь Ірына Нарбекава нязменна надзяляе вялізным пачуццём уласнай годнасці, прыўносячы ў кожны створаны вобраз любоў, дабрыню, пяшчоту, інтэлігентнасць.

Ролі ў спектаклях “Мы ідзём глядзець “Чапаева”, “Шчаўкунок”, “Востраў нашага Кахання і Надзеі”, “Пігмаліён”, “Дзядзька Ваня”, “Мышалоўка”, “Рабаванне апоўначы”, “Поле бітвы” па праве адносяцца да знакавых з'яў у беларускім тэатральным жыцці. Адну з самых прыкметных работ Ірыны Нарбекавай гледачы змогуць убачыць у 2025 годзе ў абноўленай версіі спектакля “Хто смяецца апошнім” паводле п'есы Кандрата Крапівы. У сатырычнай камедыі актрыса сыграе Ганну Паўлаўну.

Не будзе перабольшаннем назваць Ірыну Нарбекаву духоўным камертонам Тэатра кінаакцёра. Яе абсалютная творчая самааддача, актыўная грамадская і дабрачынная дзейнасць, удзел у працы праваслаўных інстытуцый выклікаюць самую шчырую павагу. На працягу многіх гадоў неад'емнай часткай жыцця актрысы з'яўляецца агучванне кінафільмаў, вядзенне духоўных праграм на радыё, работа на тэлебачанні.

Дыялог на роўных

Маладзёжны тэатр эстрады пры падтрымцы Міністэрства культуры сумесна з БРСМ 4 лістапада даў пачатак новаму этапу агульнарэспубліканскай акцыі “Разам з мастацтвам” пад назвай “Беларусь – краіна магчымасцей”.

Падчас старту акцыі

Гэта ўжо трэці этап праекта, які распачаўся летась і аднавіўся ў сакавіку на сцэне спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Як адзначыў дырэктар Маладзёжнага тэатра эстрады **Сяргей Мядзведзеў**, падчас першага і другога этапаў акцыі яе арганізатары нацэльваліся на вучняў і студэнтаў. Новы тур прадугледжвае зварот да больш дарослай аўдыторыі. Але падыходы не змяняюцца: галоўным складнікам акцыі застанецца дыялогавыя пляцоўкі, удзельнікі якіх здолеюць паразважаць аб тым, што дае сёння Беларусь маладому чалавеку, які толькі скончыў вышэйшую ці сярэднюю спецыяльную ўстанову або ўжо ўступіў у самастойнае жыццё. Творчыя людзі раскажуць, як яны прыйшлі да поспеху і папулярнасці.

Як падкрэсліў Сяргей Мядзведзеў, у нашай краіне рэалізуецца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку таленавітай моладзі пры ўдзеле ў творчых конкурсах, фестывалях, святах, а таксама прадугледжана заахвочванне маладых людзей за значны ўклад у развіццё культуры і мастацтва. Усё гэта спрыяе раскрыццю патэнцыялу адораных юнакоў і дзяўчат ды рэалізацыі іх ідэй. Будучых творцаў неабходна адукоўваць і натхняць, паказваць, што для іх існуе разнастайная падтрымка ад дзяржавы, якая дае магчымасць развівацца ў любым напрамку. Рэакцыя моладзі падчас кожнага мерапрыемства паказвае: акцыя знаходзіць водгук у іх думках і сэрцах.

Сустрэчы праходзяць у фармаце адкрытага дыялогу, удзельнікі падзелялася сваімі меркаваннямі аб магчымасцях, якія нададзеныя дзяржавай беларусам, раскажуць аб асабістым досведзе творчага росту і развіцця.

Удзельнікі дыялогавай пляцоўкі

Правядзенне агульнарэспубліканскай акцыі “Разам з мастацтвам” пад дэвізам “Беларусь — краіна магчымасцей” таксама накіраванае на патрыятычнае выхаванне насельніцтва, фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі, павагі да гісторыі, культуры і традыцый нашага народа, захаванне і ўмацаванне адзінства грамадзянскай супольнасці, заахвочванне стваральных ініцыятыў.

ШЧЫРАСЦЬ

Падчас старту новага этапу акцыі “Разам з мастацтвам” — “Беларусь — краіна магчымасцей”, які быў дадзены 4 лістапада ў Маладзёжным тэатры эстрады, да ўдзельнікаў звярнуўся генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня праўлення Беларускага таварыства “Веды” **Вадзім Гігін**. Ён адзначыў, што культура — адзін з галоўных складнікаў, якія праслаўляюць нашу краіну за мяжой. І важна дапамагаць не толькі вядомым беларусам, але і падтрымліваць моладзь з рэгіёнаў. Такія акцыі, як “Беларусь — краіна магчымасцей” і “Марафон адзінства”, паказваюць, што ў абласцях і раёнах ёсць мноства талентаў. Стаіць задача дапамагчы ім прабіцца, дасягнуць поспеху.

Як падкрэсліў Вадзім Гігін, важныя рысы беларусаў — адкрытасць і шчырасць, і менавіта яны патрэбныя артысту. Мы можам абмяркоўваць самыя розныя пытанні — творчыя, вытворчыя, палітычныя, эканамічныя... І калі будзем гаварыць шчыра і гэтак жа паводзіць сябе на сцэне, то людзі будуць нам верыць. Не можа быць добрым артыст, калі ён выходзіць на публіку і не верыць у тое, што робіць.

АДКРЫТАСЦЬ

Госцем дыялогавай пляцоўкі таксама стаў народны артыст Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік ансамбля “Верасы”, піяніст, кампазітар, аранжыроўшчык і педагог **Васіль Раінчык**. Ён распавёў, якой працай давалася творчасць у часы яго станаўлення і якую ролю ў гэтым адыгрывала падтрымка з боку дзяржавы. З вітальным словам да ўдзельнікаў звярнулася і другі сакратар Маскоўскага раённага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Ксенія Балаболава. Падчас старту акцыі новым членам былі ўручаныя білеты саюза.

Перад удзельнікамі мерапрыемства выступілі артысты тэатра: заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Жанэт, ансамбль “Верасы” ды гурт “Зямля і Неба”. У фае былі прадстаўленыя экспанаты, перададзеныя ў розных рэгіёнах удзельнікам папярэдняга этапу акцыі, які быў прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут можна было пабачыць пано, копіі франтавых лістоў, дыярамы, франтавыя альбомы, кнігі і тэматычныя карціны.

ЗНОЎ У ДАРОГУ

Падчас новага этапу акцыі дзеячы культуры і мастацтва наведаюць 10 дыялогавых пляцовак у Мінску, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях. У рэгіёнах будуць зладжаны тэматычныя выставы малюнкаў, фота, пано, інсталяцый аб знакавых мясцінах і славутых ураджэнцах. Асноўная мэта такіх экспазіцый — выхаванне патрыятызму, пачуцця гонару за краіну, знаёмства з гісторыяй і дасягненнямі роднага краю.

Для правядзення акцыі пад дэвізам “Беларусь — краіна магчымасцей” таксама распрацаваны брэндбук, які складаецца з лагатыпа, улётак, афіш і відэароліка. Спампаваць брэндбук з сімволікай акцыі можна на афіцыйным сайце Маладзёжнага тэатра эстрады estrada.by, клікнуўшы на тэматычны банер. Наступная сустрэча адбудзецца 13 лістапада ў Магілёўскай вобласці.

Антон РУДАК
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Знак падзякі

Савет спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі і Міністэрства культуры абвясцілі конкурс для прысуджэння ўзнагароды “За ўклад у выхаванне таленавітай моладзі”.

Гэтай узнагароды ўдастойваюцца асобы, якія ў мінулыя два гады падрыхтавалі пераможцу міжнароднага мастацка-творчага спаборніцтва, уладальніка Гранд-прэміі фонду; не менш за двух пераможцаў міжнародных і (або) рэспубліканскіх мастацка-творчых спаборніцтваў, уладальнікаў спецпрэміі фонду. Акрамя таго, узнагарода прысуджаецца адмыслоўцам, якія зрабілі асабісты ўнёсак у распрацоўку і рэалізацыю методыкі навучання таленавітай моладзі, вынікам чаго сталі перамогі на міжнародных і (або) рэспубліканскіх спаборніцтвах, а таксама ў арганізацыю культурных мерапрыемстваў міжнароднага і (або) рэспубліканскага ўзроўню, накіраваных на выяўленне і развіццё здольнасцей творчай моладзі.

Дакументы прымаюцца Міністэрствам культуры да 1 студзеня 2025 года.

З падрабязнасцямі можна азнаёміцца на афіцыйным сайце ведамства

З падзякай за створанае

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь адзначае 85-годдзе

Дата заснавання скарбніцы — 24 студзеня 1939 года. А 5 лістапада 1957 года адбылося ўрачыстае адкрыццё гістарычнага будынка музея па вуліцы Леніна, 20. У гонар свята на тыдні тут прайшла ўрачыстая цырымонія. Сярод гасцей — прадстаўнікі дзяржорганаў, Беларускай праваслаўнай царквы, работнікі і ветэраны музея, калегі з розных арганізацый культуры, славутыя мастакі, іншыя ганаровыя асобы.

АФІЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

З віншаваннем да супрацоўнікаў музея звярнуўся першы намеснік міністра культуры Валерый Грамада.

— Створаная ў 1939-м Дзяржаўная карціннная галерэя перажыла Вялікую Айчынную вайну, страціўшы значную частку калекцыі. У няпросты пасляваенны час дзяржава надавала вялікую ўвагу ўстанове. Быў узведзены новы будынак. І сёння ўвага кіраўніцтва краіны да музея не слабее. Па рашэнні Прэзідэнта рэалізуецца маштабны праект па стварэнні музейнага квартала. Але музей — гэта не толькі сцены і карціны, але яшчэ і людзі.

Ад імя ведамства Валерый Грамада выказаў падзяку камандзе мастацкай скарбніцы за адданасць прафесіі і ўручыў узнагароды Міністэрства культуры.

ВІНШАВАННІ

Юбіляраў ушаноўвала і старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццяна Філімонава. Уручаючы ўзнагароды, яна падкрэсліла: сёння Нацыянальны мастацкі музей — вядучая ўстанова культуры нашай краіны.

Захопленыя водгукі аб рабоце калектыву НММ і яго дасягненнях выказала генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава.

Акадэмік НАН Беларусі, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар Аляксандр Лакотка падзякаваў калектыву-юбіляру за шматгадовае плённае супрацоўніцтва і адзначыў: у свой час работнікі Музея старажытнабеларускай культуры шмат чаму навучыліся ў сваіх калег, што было важна для далейшага развіцця ўстановы.

Цёплымі ўспамінамі падзяліўся і народны мастак Беларусі, скульптар Іван Міско.

У гонар юбілейнай даты вядомыя майстры пэндзля падарылі музею свае творы. Таксама карціну ў дар перадаў Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П.В. Масленікава.

Пасля ўрачыстай цырымоніі гасцей Нацыянальнага мастацкага музея запрасілі азнаёміцца з юбілейнай выставай "Страты і вяртанні. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай Карціннай галерэі. 1939–1957".

АД УСЁЙ ДУШЫ

Урачыстасці, прымеркаваныя да 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, працягнуліся ў Белдзяржфілармоніі. Шматлікія госці пазнаёміліся з экспазіцыяй афіш выстаў розных гадоў.

Павіншаваць юбіляраў прыйшлі дзеячы мастацтва і культуры, калегі па творчым цэху, рупліўцы прыгожага. Генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Мікіта падзякаваў калектыву Нацыянальнага мастацкага музея за тую веліч, якую ім разам з папярэднікамі ўдалося стварыць. Падкрэсліў, што гэта праца сапраўдных прафесіяналаў і яе плёнам краіна ганарыцца па праве.

Вялікай павагай да калектыву і шчырай падзякай кожнаму работніку, ветэранам працы і папярэднікам за іх уклад у агульную справу было прасякнута выступленне генеральнага дырэктара Ганны Конанавай. Бо аснова асноў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — гэта людзі, дзякуючы намаганням якіх арганізуюцца новыя экспазіцыі і выставы, вядуцца асветніцкія праекты, выдаюцца кнігі і каталогі, папаўняюцца, захоўваюцца, даследуюцца, рэстаўруюцца і прапагандуюцца творы мастацтва.

— Вы ўсе — стваральнікі сённяшняй велічы Нацыянальнага мастацкага музея, творцы яго гісторыі, — падкрэсліла Ганна Уладзіміраўна.

Душэўна прайшла цырымонія ўзнагароджання супрацоўнікаў музея. Сярод тых, хто паднімаўся на сцэну, былі загадчык гаспадарчага аддзела і маркетолаг, кантралёр білетаў і вадзіцель, загадчык фоталабараторыі, музейныя наглядчыкі, энергетык... У Мастацкім музеі кожны работнік — каштоўны!

ПАДАРУНКІ

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" прадставіла гледачам фільм аб шляху, які прайшоў за 85 гадоў Нацыянальны мастацкі музей. Кінастужка стала сапраўдным падарункам для руплівага калектыву.

Разнастайнасцю яркіх нумароў уразіў святочны канцэрт. У праграме ўдзельнічалі як майстры сцэны, так і юныя артысты. Сваёй творчасцю гасцей пацешылі Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі" і яго дзіцячая студыя, ансамбль цымбалістаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, балет школы Марыны Вежнавец, калектыў "AMADIS. Brass", салістка Маладзёжнага тэатра эстрады Гюнэш, іншыя выканаўцы.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Праз страты да роскві́ту

Гісторыя найбагацейшай мастацкай скарбніцы Беларусі даволі пакручастая. Толькі сціплая каманда на чале з Мікалаем Міхалапам заклала аснову калекцыі — грымнула ліхалецце, што прынесла незлічоныя страты маладой, але даволі нябеднай на шэдэўры ўстанове. Затым надышлі няпростыя гады пасляваеннага адраджэння. Ізноў — сіламі маленькага калектыву, які ўзначаліла сапраўдная падзвіжніца Алена Аладава.

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь — найбуйнейшае фондавае і экспазіцыйнае сховішча прадметаў мастацтва ў нашай краіне. Тут сабрана самая вялікая ў свеце калекцыя твораў беларускага мастацтва. Сёння ва ўсіх зборах і фондах музея налічваецца каля 37 000 артэфактаў з больш чым 130 краін, якія ахопліваюць 12 стагоддзяў гісторыі чалавецтва.

Пра гэтыя перыпетыі распавядае выстава, што разгарнулася ў Нацыянальным мастацкім музеі да яго 85-годдзя. Юбілейная экспазіцыя закранае тры важныя этапы з 1939 па 1957 год: фарміраванне Дзяржаўнай карціннай галерэі, яе разграбленне нямецка-фашысцкімі захопнікамі, узнаўленне калекцыі ды будаўніцтва галоўнага корпуса.

ПЕРШЫЯ КРОКІ

За кароткі перыяд — з 1939-га па 1941-ы — галерэя правяла чатыры выставы, арганізавала збор прадметаў па ўсёй рэспубліцы. Дапамагалі мастакі, народныя майстры, шматлікія цэнтральныя і рэгіянальныя музеі. Сярод першых экспанатаў — палатно "Духаў манастыр" Міхася Філіповіча. Збераглісся таксама "Вячэрняе сонца" Льва Зевіна, эскізы Фёдара Мадорава да карціны "Народны сход у Заходняй Беларусі".

СТРАТЫ ЛІХАЛЕЦЦЯ

У сучасных зборах Нацыянальнага мастацкага — толькі восьмая частка даваенных калекцый. З нападам нацыстаў эвакуіраваць галерэю не паспелі: бамбёжкі, недахоп транспарту і людзей. Калі беларускую сталіцу занялі акупанты, пачалося рабаванне скарбніцы. Мюнхен, Франкфурт-на-Майне, Кёнігсберг — каштоўныя экспанаты вывозілі ў нямецкія гарады. Згодна з вопісам, які музейныя спецыялісты склалі пасля вызвалення Мінска ў 1944-м, страчаны сотні жывапісных палотнаў, скульптур, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у тым ліку некалькі дзясяткаў слуцкіх паясоў. Лёс многіх твораў дагэтуль застаецца невядомым.

Трагічным старонкам прысвечана асобная зала. У цэнтры паўстала інсталяцыя, што нібыта аднаўляе тыя дні, калі экспанаты пакавалі і вывозілі ў Германію. Слуцкі пояс, рознакаляровая тканая посцілка, мармуровыя бюсты, парадныя партрэты і... цёмна-шэрыя драўляныя скрыні з надпісамі па-нямецку: "Не перакульваць". На сценах разам з карцінамі вісяць масіўныя рамы — пустыя. Надзвычай гучны вобраз згубленых шэдэўраў нагадвае аб тым, як акупанты нажамі выразалі палотны з рам, каб забраць з сабою. На этыкетках пазначаны звесткі толькі маленькай долі скрадзеных работ. "Партрэт дачкі ў блакітным" Валянціна Волкава, "Квітнеючы сад" Анатоля Тычыны, "Канал гатовы" Фёдара Мадорава, "Зіма" Івана Айвазоўскага, "Мадрыдскі карлік" Зянона Ленскага... Месцазнаходжанне іх дагэтуль невядомае.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Пашчасціла вярнуць экспанаты, што напярэдадні Вялікай Айчыннай былі на выставах у Расіі. Таксама некаторыя прадметы былі знойдзены савецкімі салдатамі ва Усходняй Прусіі і ў разбураным Мінску. Цудам у горадзе засталіся драўляныя скульптуры Аляксандра Грубэ, некалькі палотнаў Ісака Левітана, Уладзіміра Кудрэвіча, іншых мастакоў.

Тым не менш з выгнаннем ворага пачалося аднаўленне. Гэта была сапраўды гераічная праца, завадатарам якой выступіла легендарная Алена Аладава. Спачатку галерэі даводзілася туліцца ў васьмі пакоях ацалелага Дома прафсаюзаў. Неўзабаве ў горадзе, што ляжаў у руінах, узяліся за ўзвядзенне асобнага будынка для скарбніцы. Урэшце паўстаў манументальны корпус, што і сёння з'яўляецца адной з візітовак Мінска, была адноўлена колькасць даваенных фондаў, галерэя атрымала статус Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

ТОЛЬКІ НА ФОТА

Яшчэ адной перлінай выставы можна лічыць прэзентацыю "Засталося толькі на фотаздымках". Яна прысвечана страчаным творам, сляды якіх маюцца толькі ў каталогах, газетах і часопісах, асабістых архівах. Сапраўдная знаходка — фатаграфіі са збораў першага дырэктара Дзяржаўнай карціннай галерэі, мастака-кераміста Мікалая Міхалапа. Дапаўняюць часовую экспазіцыю выявы і копіі архіўных дакументаў, што адлюстроўваюць розныя этапы ў гісторыі ўстановы. Ёсць сярод іх першапачатковы эскіз галоўнага корпуса музея, аўтарам якога з'яўляецца архітэктар Міхаіл Бакланаў.

Даніл ШЭЙКА
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Мінпрацы: заробкі бюджэтнікаў за 2025 год павінны вырасці на 15%.

Налета пенсіі павялічацца ў сярэднім на 14%.

Дзве паездкі — тры тэатры-браты

"Дзікае паляванне караля Стаха" на сцэне Марыінскага тэатра

"Кармэн" Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага дзіцячага музычнага тэатра імя Наталіі Сац

У канцы кастрычніка Вялікі тэатр Беларусі перажыў дзве значныя падзеі. У рамках Дзён Мінска ў Санкт-Пецярбургу на сцэне Марыінскага тэатра было паказана "Дзікае паляванне караля Стаха". А ў беларускай сталіцы гастраляваў Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатр імя Наталіі Сац. Дарэчы, мастацкі кіраўнік калектыву народны артыст Расіі Георгій Ісаакян неўзабаве будзе ставіць у нас "Арлеанскую дзеву" Чайкоўскага.

БЕЛАРУСКІ ВЯЛІКІ Ў МАРЫІНЦЫ

Гэта першае выступленне нашага тэатра на славутай сцэне. І яно аказалася папраўдзе феерычным. У зале прысутнічалі вядучыя расійскія музычна-тэатральныя крытыкі Святлана Рухля, Наталля Кажэўнікава. Яны ў адзін голас ухвалілі і музыку Уладзіміра Солтана, і яе інтэрпрэтацыю дырыжорам Юрыем Караваевым, і ўласна пастаноўку, асабліва шматлікія цікавыя прыдумкі галоўнага рэжысёра Вялікага тэатра Беларусі Ганны Маторнай. У цэнтры ўвагі былі салісты: Алена Золава (Надзея Яноўская), Уладзімір Громаў (Андрэй Беларэцкі), Дзмітрый Шабеця (Дубатоўк), Станіслаў Трыфанаў (Алесь Варона), Андрэй Валенцій (Рыгор) і іншыя.

— Мы многае бачылі, — сказаў пасля прагляду першы намеснік мастацкага кіраўніка — дырэктара Марыінскага тэатра **Яўген Стадушны**, — але спектакль, які прывезлі вы, нас проста ўразіў.

МАСКОЎСКІ ДЗІЦЯЧЫ Ў МІНСКУ

У тыя ж дні на сцэне Вялікага тэатра Беларусі гасцяваў Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны дзіцячы музычны тэатр імя Наталіі Сац, якому хутка споўніцца 60 гадоў. Калектыў прывёз дзве оперы. Кожная паказвалася двойчы ды ішла на рускай мове.

Спектакль "Валадар мух" дэманстраваўся пад фанаграму-мінусоўку і прызначаўся найперш для падлеткаў, што бываюць абдзелены тэатральным рэпертуарам па ўзросце. У аснове гэтай рок-класік-оперы знанага расійскага кампазітара Яфрэма Падгайца, які днямі справіў 75-годдзе, — аднайменны раман англійскага пісьменніка лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Ўільяма Голдынга. У спектаклі, уганараваным прэміяй Урада Расіі ў галіне культуры (2009), закранаюцца такія важныя для моладзі праблемы, як ступень чалавечай адказнасці, разуменне свабоды і яе меж, супрацьпастаўленне спагады і агрэсіі.

Асаблівасць "Кармэн" — выкарыстанне работ Пабла Пікаса. Яны прысутнічаюць і на заслонах, і ў якасці афішы бою быкоў, і як праекцыі каментарыя таго, што адбываецца на арэне ў час забойства гераіні.

— І навела Мерымэ, і напісаная паводле яе опера Бізэ — творы французскія, але пра Іспанію, — пракаментаваў такое сцэнаграфічнае рашэнне рэжысёр спектакля, мастацкі кіраўнік тэатра імя Сац, народны артыст Расіі **Георгій Ісаакян**. — Пікаса ж нарадзіўся ў Іспаніі, а большую частку жыцця правёў у Парыжы. І адлюстраванне карыды было адной з улюбёных тэм аўтара. На гэтыя франка-іспанскія паралелі мы і хацелі звярнуць увагу публікі, паказаўшы нібыта погляд Пікаса на оперу.

ПАБРАЛІСЯ КЕЙСТУТ З БІРУТАЙ

Дарэчы, Георгій Ісаакян узначальвае Асацыяцыю музычных тэатраў, у якую летась уступіў і наш Вялікі. Намаганнямі гэтага творчага аб'яднання былі арганізаваны ўжо восем фестываляў "Бачыць музыку". У размове з журналістамі Георгій Георгіевіч выказаў спадзеў, што ў дзявятым паўдзельнічае і наш тэатр. "К" зацікавіла яшчэ адна тэма — сцэнічнае ўвасабленне Ісаакянам незавершанай опернай партытуры Скрабіна "Кейстут і Бірута" ў тэатры "Гелікон-опера" ў 1992-м. Тыя героі маюць самае непасрэднае дачыненне да гісторыі Беларусі і з'яўляліся ў балеце "Вітаўт" Вячаслава Кузняцова, пастаўленым у нашым Вялікім тэатры і ўганараваным прэміяй Прэзідэнта "За духоўнае адраджэнне".

— Спектакль "Кейстут і Бірута" быў удалым эксперыментам, — распавёў Георгій Ісаакян. — Я нават не магу дакладна сказаць, каму першаму прыйшла ў галаву ідэя такой пастаноўкі: мне ці кіраўніку "Гелікон-оперы" Дзмітрыю Бертману. У пачатку дзейнасці калектыў актыўна шукаў, чым здзівіць распешчаную маскоўскую публіку, і спыніўся на рукапісах Скрабіна. Музычнага матэрыялу было мала, і мы вырашылі паказаць оперу двойчы за вечар — у пастаноўчых версіях, што закранаюць розныя эпохі, і з рознымі сэнсавымі акцэнтамі: у адным варыянце — на Кейстуце, у другім — на Біруце.

Падчас размовы падумалася: чаму б не зрабіць падобнае ў нашым тэатры? Да прыкладу, сумясціць у адным вечары оперную гісторыю Кейстута і Біруты з фрагментам балетнай — іх сына? Ці далучыць яшчэ "Спевы даўнейшых ліцвінаў" усё таго ж Кузняцова (адна з частак харавога цыкла прысвечана гэтым героям). Дарэчы, згаданая нізка аздоблена ўдарнымі. Яна так і просіць далейшай тэатралізацыі — са сцэнічнымі строямі, з рэжысурай, відэа.

Не менш цікавай уяўляецца ідэя паказваць оперныя аднаактоўкі двойчы за вечар. Яна выдатна падышла б раннім опусам Станіслава Манюшкі, "Тарасу на Парнасе" Мікалая Аладава, школьнай оперы XVIII стагоддзя "Апалон-заканадаўца, ці Рэфармаваны Парнас" Рафаэля Вардоцкага (апроч арыгінала ёсць музычная рэдакцыя Дзмітрыя Смольскага) і іншым не надта вядомым творам.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Глеба МЯРЗЛІКІНА і з архіваў тэатра

Сцэна са спектакля "Кармэн"

Палескі драматычны тэатр едзе з гастролямі ў Магілёў: 1 снежня — "Пан Твардоўскі".

Музей на выездзе

Перасоўныя выставы Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея — важная частка экспазіцыйнай работы ўстановы. Асаблівую цікавасць выклікаюць тэматычныя праекты, у прыватнасці — ваенна-гістарычныя.

Многія жыхары Бярозы памятаюць перасоўныя выставы "Помнікі Вялікай Перамогі", "Бессмяротны полк", "Плакатысты — фронту", "Жанчыны Перамогі", "Подзвігу народа прысвячаецца...". Зараз у рамках праекта "Музей на выездзе" прапануецца банерная перасоўная выстава "Вызваляючы беларускія землі...", прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Бярозаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Жыхары і госці горада ўжо мелі магчымасць азнаёміцца з ёй на урачыстасцях у ліпені. Выстава-банер можа быць дастаўлена на прадпрыемства або ў арганізацыю. Экспазіцыя даступная для ўспрымання і не патрабуе прысутнасці навуковага супрацоўніка, паколькі мае шматгранную тэкставую інфармацыю. Першым выказала жаданне "адкрыць музейную прастору" непасрэдна на пляцоўцы адміністрацыйнага будынка кіраўніцтва Бярозаўскага мясакансервавага камбіната. Калектыў прадпрыемства ацаніў інфарматыўнасць, даступнасць інтэлектуальнага прадукту непасрэдна на працоўным месцы. Наступнай арганізацыяй, якая прыняла эстафету, стаў філіял Бярозаўскай ГРЭС РУП "Брэстэнерга".

Аб'ёмны дакументны і тэкставы матэрыял, фотаздымкі размешчаны на сямі банерах у адпаведнасці з распрацаваным навуковымі супрацоўнікамі тэматыка-экспазіцыйным планам і сучасным падыходам у мастацкім афармленні. Першы знаёміць з беларускай наступальнай аперацыяй "Баграціён", этапамі яе правядзення на тэрыторыі Бярозаўскага раёна, з палкаводцамі будучай перамогі, распрацоўшчыкамі і каардынатарамі яе паспяховага ажыццяўлення. Гэта маршалы Савецкага Саюза Г. Жукаў, К Ракасоўскі, А. Васілеўскі, генералы арміі А. Антонаў, І. Чарняхоўскі, І. Баграмян і іншыя. Тут жа размешчана і карта вызвалення Бярозаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 12—17 ліпеня 1944 года, якую распрацавалі афіцэры ў адстаўцы У. Няпарка, У. Еўхуціч, Ю. Тараненка.

Значную частку мабільнай экспазіцыі займаюць матэрыялы аб вайсковых частках і злучэннях, іх камандзірах, афіцэрах і салдатах-вызваліцелях, што напаўняюць тры банеры з агульнай назвай "Агнявыя рубяжы дывізій". Пра тое, як вызвалялі Бярозу, распавядаюць успаміны генерал-маёра Г. Корчыкава, камандзіра 48-й гвардзейскай Крыварожскай стралковай дывізіі ды інш.

У цяжкіх баях за вёску Шылін змагаліся часці 20-й Баранавіцкай двойчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава і стралковай дывізіі пад камандаваннем палкоўніка І. Несцярэнкі. На трэцім банеры адкрыты для прагляду фатаграфіі і ўспаміны камандзіраў стралковых і артылерыйскіх палкоў, а таксама ўзнагародныя лісты на загінулых.

Агнявыя рубяжы 152-й Днепрапятроўскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава II ступені дывізіі пад камандаваннем палкоўніка А.Т. Кузіна і 61-й стралковай (камандзір палкоўнік А.Г. Шацкоў) праходзілі ў крывапралітных баях за вёску Сялец і яе наваколлі. Поспех бітвы забяспечвалі камандзіры і байцы 333-га, 554-га, 646-га, 480-га, 66-га, 221-га, 307-га стралковых палкоў. Гэты кірунак вызваленчай аперацыі ілюструюць матэрыялы чацвёртага банера: схема бою пры прарыве нямецкай абароны на рацэ Ясельдзе, шматлікія фотаздымкі, узнагародныя дакументы, успаміны ўдзельнікаў вызвалення. Бярозаўчане асабліва выдзеляць імёны герояў-вызваліцеляў Героя Савецкага Саюза, камбата маёра А. Антонава, камузвода, мінамётчыка А. Бурамскага, выведніка старшыну В. Вайцяхоўскага, стралка-пехацінца старшага сяржанта Я. Сулейманава, лейтэнанта ветэрынарнай службы дывізіённага лазарэта В. Елькіна.

Пяты банер перасоўнай выставы з назвай "Змагаліся партызанскія атрады" распавядае пра ўклад удзельнікаў партызанскага руху ў агульную доўгачаканую перамогу над ворагам. Тут прадстаўлена схема размяшчэння партызанскіх брыгад і атрадаў на тэрыторыі Бярозаўскага і прылеглых да яго раёнаў, падпольнага абкама КП(б)Б, абласнога антыфашысцкага камітэта Брэсцкага злучэння з 1942-га па 1944-ы гады, а таксама партрэты камандзіра Брэсцкага злучэння, сакратара Брэсцкага падпольнага абкама КП(б)Б С.І. Сікорскага і начальніка штаба злучэння П.В. Пранягіна, камандзіраў брыгад І.П. Урбановіча, Н.У. Бабкова, В.М. Манахава, І. П. Марынякі, Асобнага атрада № 345 С.А. Яроцкага.

Лагічным працягам экспазіцыі стаў шосты банер "Здзітаўская абарона: непераадольная мяжа для ворага". Наведвальнікаў могуць зацікавіць успаміны байцоў, групавыя фотаздымкі партызан, а таксама партызанская творчасць: малюнкі палітрука 1-й роты 345-га партызанскага атрада Сяргея Назаравіча Бельскага, а таксама верш "Пераправа" начальніка разведкі, камісара атрада імя С.М. Будзёнага Паўла Канстанцінавіча Каламійцава.

Апошні, сёмы банер з назвай "Захаваем для нашчадкаў" змог змясціць самы аб'ёмны фотаматэрыял з падтэкстоўкамі з музейнай калекцыі, які адлюстроўвае пошукавую працу юных следапытаў, журналістаў, краязнаўцаў, музейных работнікаў, увекавечванне подзвігу воінаў-вызваліцеляў у мемарыялах, захаванне памяці аб сустрэчах з франтавікамі, партызанамі, сваякамі загінулых на Бярозаўскай зямлі. Неацэнныя таксама такія дакументы, як асабістая справа П.С. Грыгарэнкі, старэйшага ад'ютанта стралковага батальёна 143-га стралковага палка 48-й стралковай дывізіі, анкета ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны П.С. Таканава, лісты былога камандзіра 174-га стралковага палка Г.П. Ганчарова; фотакадры, якія захавалі запальванне Вечнага агню ў Камсамольскім скверы г. Бярозы 7 лістапада 1967 года, ганаровай варты пакалення 1960—1970-х у Камсамольскім скверы і на Вайсковых могілках д. Шылін.

Музейная выстава на выездзе — гэта даступна, пазнавальна, цікава і зручна.

Ала ДРАГАН,
супрацоўніца Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея

Музычны канцэрт "Жаночае шчасце" — 8 лістапада ў Віцебскай абласной філармоніі.

Ірына КОЎЛЕНА

Галоўны рэжысёр Цэнтра культуры “Віцебск”, мастацкі кіраўнік акадэмічнага харавога калектыву, лаўрэат прэміі Саюзнай дзяржавы, уладальніца звання “Чалавек года Віцебшчыны – 2012”.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 354 ад 9 верасня 2024 года **Ірына Коўлена ўдастоена ордэна Францыска Скарыны**.

За добрасумленную творчую работу Ірына Віктараўна атрымала падзяку Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, нагрудны знак Міністэрства культуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" ды іншыя ўзнагароды.

1966

Ірына Віктараўна нарадзілася 8 кастрычніка 1966 года ў Віцебску.

1981

Прафесійную падрыхтоўку пачала ў Віцебскім музычным вучылішчы. У 1998-м скончыла Мінскі інстытут культуры.

Цэнтр культуры "Віцебск" — першае і адзінае месца працы Ірыны Коўленай. Тут яна шчыруе 35 гадоў

І. В. Коўлена ўнесла асабісты ўклад у развіццё фестывальнага руху ў Віцебску. XXII Міжнародны дзіцячы музычны конкурс "Віцебск", 2024

1989

Прынята ў якасці хормайстра ў Цэнтр культуры і вольнага часу Віцебска. Потым працавала метадыстам, артысткай народнага тэатра гульні, які праз некаторы перыяд узначаліла.

2009

Прызначана намеснікам генеральнага дырэктара Цэнтра культуры “Віцебск” па культурна-масавай рабоце.

2011

Узначаліла рэжысёрска-пастановачную службу Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу “Віцебск”. У 2012-м была рэжысёрам XXI Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск” у рамках XXI Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

Ірына Коўлена — аўтар слоў і музыкі многіх твораў. Кампазіцыя "Песні васільковага колеру" ўжо шмат гадоў гучыць са сцэны Летняга амфітэатра

Навагодні мюзікл-прыгода "Алмаз ведаў", 2023

2014

Прызначана рэжысёрам Цэнтра культуры “Віцебск”, праз пяць гадоў – галоўным рэжысёрам.

2022

Аўтарскаму калектыву, у складзе якога была і Ірына Коўлена, прысуджана прэмія Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2021–2022 гады за канцэртныя праграмы ў рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

Праекты, якімі загадвае І. В. Коўлена: Міжнародны дзіцячы музычны конкурс “Віцебск” у рамках “Славянскага базару”, Міжнародны фестываль-конкурс “Арт-парад у Віцебску”, абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі “Дажынкі” і шматлікія іншыя. Толькі за 2023 год пад непасрэдным кіраўніцтвам рэжысёра праведзена больш за 60 мерапрыемстваў. Сёння Ірына Віктараўна ўдзяляе вялікую ўвагу падрыхтоўцы Віцебска да наступнага “Славянскага базару”.

У Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту 9 лістапада – свята “Караваю, мой раю”.

Творчасць з агеньчыкам

Народны жаночы вакальны ансамбль “Задорніцы” адзначыў 75-годдзе. Артысткі аддаюць перавагу беларускім фальклорным творам, у тым ліку ў апрацоўцы вядомых і мясцовых кампазітараў. Часам выканаўцы самі робяць аранжыроўкі, і песні пачынаюць гучаць асабліва цёпла, па-дамашняму.

МУЗЫЧНЫ ШЛЯХ

Калектыў працуе пры раённым Цэнтры культуры Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Клімавіцкага раёна.

— У 1949 годзе пры раённым Доме культуры быў створаны хор народнай песні, якім кіраваў заслужаны дзеяч культуры БССР Леанід Ячнеў, — расказвае загадчык аддзела традыцыйнай культуры РЦК **Таццяна Фрузорава**. — У 1973-м хору прысвоілі званне народнага. Штогод калектыў рыхтаваў новыя праграмы, удзельнічаў у аглядах-конкурсах, а таксама ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіліся ў горадзе і раёне.

Дзякуючы поспехам артысткі ў 1974-м былі запрошаны на ВДНГ у Маскву на агляд-конкурс, дзе атрымалі дыплом II ступені. Яшчэ яны ездзілі на I Усесаюзны фестываль самадзейнай творчасці працоўных калектываў і заваявалі дыплом I ступені. Хор браў узнагароды на многіх аглядах-конкурсах, у тым ліку на міжнародных, удзельнічаў у Днях культуры Магілёўскай вобласці ў Польшчы і Малдове. З поспехам прайшлі канцэрты ў расійскіх гарадах Уладзіміры і Суздалі.

З 2004 года калектыў узначальвала настаўнік Клімавіцкай дзіцячай школы мастацтваў Таццяна Смірнова, якая паказала сябе як творчы, актыўны, здольны кіраўнік. Пасля яе з'яўлення склад выканаўцаў абнавіўся, была падрыхтавана свежая праграма, з якой спявачкі пачалі выступаць не толькі ў Клімавічах, але і па-за межамі краю. У 2012-м Таццяну Смірнову змяніла Наталля Тарноўская.

— Ніводнае мерапрыемства ў горадзе ці раёне не абыходзіцца без гэтага хору — ні прафесійнае свята, ні народны абрад, ні ўрачыстая цырымонія ці канцэртная праграма, прысвечаная знамянальнай даце, — заўважае Таццяна Фрузорава. — Сваімі выступленнямі таленавітыя жанчыны дораць публіцы шмат цёплых момантаў.

У 2019-м склад калектыву змяніўся, а ён атрымаў новую назву — народны жаночы вакальны ансамбль “Задорніцы”. Але самадзейныя артысткі працягнулі ярка крочыць па музычным шляху. Толькі за тры апошнія гады спявачкі паспяхова паўдзельнічалі ў расійска-беларускім фестывалі народнай творчасці “Дзве Русі — дзве сястры”, у Міжнародным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці “Парубежжа” ў Смаленскай вобласці, ва Усерасійскім фестывалі-конкурсе мультыжанравага мастацтва “Сімфонія талентаў” і ў Міжнародным конкурсе мастацтва і творчасці “Я зорка!” у Санкт-Пецярбургу. Перамогі здабывалі і на Радзіме: на міжрэгіянальным фестывалі-конкурсе народнай творчасці “Крычаўскі канёк”, рэгіянальным фестывалі народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў “Дрыбінскія таржкі” ды на многіх іншых пляцоўках.

ВАЖКІ ЎНЁСАК

Рэпертуар “Задорніц” складаецца з беларускіх, рускіх, савецкіх песень. Здараецца, што выканаўцы пішуць тэксты, адаптуючы арыгіналы пад пэўнае мерапрыемства ці аўдыторыю.

Цяпер у калектыве з нецярпеннем чакаюць новага кіраўніка: Наталлю Тарноўскую праводзілі замуж у іншую вобласць.

— Цудоўны чалавек і кіраўнік. Пры ёй мы шмат новага напаткалі, перамог у скарбонцы “Задорніц” дадалося, — кажа Галіна Шапавалава. — На сёння працуем самастойна, усё лета былі годныя выступленні — імкнёмся падтрымліваць высокую планку творчасці, уносячы ўклад у культуру роднага Клімавіцкага краю.

Святлана ЧЭКАЛАВА
Фота з архіва калектыву

Стараста “Задорніц” Галіна Шапавалава выступае на сцэне ўжо 45 гадоў.

— У канцы 1970-х я працавала загадчыцай Клімавіцкай друкарні, — дзеліцца ўспамінамі Галіна Фамінічна. — На адным з аглядаў-конкурсаў мастацкай самадзейнасці мясцовых калектываў прадстаўляла сваю арганізацыю — спявала. Тады мяне і заўважыў кіраўнік народнага хору Леанід Ячнеў, запрасіў да іх. Пагадзілася — хоць на той момант, прызнацца, не ўяўляла, што такое альт ці сапрана. Але з песняй я знаёмая з дзяцінства. Сям'я ў нас была музычная. Бацька граў на гармоніку, мама вельмі прыгожа спявала. Ды і мы, усе восем дзяцей, з творчасцю сябравалі: хлопчыкі гралі на розных інструментах, а дзяўчынкі пелі.

У хору было шмат выступленняў у СССР і за мяжой. Усюды нас сустракалі цёпла: мы працавалі на сцэне ад душы, а глядач гэта адчуваў. Добрыя традыцыі працягнуліся і ў рэарганізаваным калектыве, у “Задорніцах”. Цяпер у ім 13 удзельніц. І хоць малодшай 64 гады, а самай старэйшай — 88, назва ансамбля цалкам адпавядае выступленням: усе выканаўцы з агеньчыкам! На месцы ніколі не стаім — мы і станцаваць здольныя. Падчас канцэртаў публіка падтрымлівае нас не толькі апладысментамі: і падпявае, і танчыць. Усюды мы быццам свае.

Больш культурных навін – у нашым Telegram-канале @kultinfa.

(Працяг. Пачатак у “К” № 42, 2024)

З пакалення асвечаных

Руіны падмурка

Кар'ер на месцы сядзібы Глінскіх, Косічы

Адкрываем новыя старонкі біяграфіі адной з беларускіх паэтак — Тэафілі Глінскай, чыё жыццё прыйшлося на другую палову бурлівага XVIII стагоддзя. Спадчына творцы ўключае паэму, вершы, пераклады. Але па дзіўным збегу абставін у нас гэты набытак зусім невядомы.

РОДНЫ КРАЙ

Наша гераіня жыла ў ваколіцах возера Свіцязь — гэта сэрца Навагрудскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Што ў тыя часы ўяўляла з сябе малая радзіма літаратаркі — Вялікія Косічы?

Першая згадка маёнтка прыпадае на 1500-ы. Уладанні Глінскіх размяшчаліся на адгор'і высокай ледавіковай грады. Сядзіба стаяла на самай вяршыні, і з даху ўсё было бачна на многія кіламетры. З трох бакоў гару атачала багністая раўніна. Дарэчы, днямі я наведаўся ў Косічы. На вялікі жаль, палова той гары аказалася зрыта кар'ерам. На яго краі, адкуль усё яшчэ адкрываецца захапляльны від, заўважыў руіны. Напэўна, нейкім цудам захаваўся маленькі кавалак сядзібнага падмурка. Тут я запаліў памятны зніч.

ГІСТОРЫЯ СЯМ'І

Бацькі Тэафілі — Крыштаф Глінскі і Тэафіля Галухоўская — пабраліся шлюбам каля 1760-га. Налета ў сям'і нарадзіўся першынец, якога назвалі Феліцыянам-Крыштафам. За ім, у 1762-м або ў 1763-м, на свет прыйшла Тэафіля, потым — Людвіка (1764) і Тэафіл-Казімір, якога ахрысцілі 1 сакавіка 1767 года. Сярод іншых ганаровай сведкай на таемстве ў малодшага брата была Тэафіля (у дакументах яна, за выключэннем аднаго выпадку, фігуруе як Багуміла або як Багуміла-Сафія).

НА ФОНЕ ЭПОХІ

Са сконам у 1763-м Аўгуста III Саксонскага завяршыўся працяглы перыяд спакою. У выніку зацятай палітычнай барацьбы каралём абралі Станіслава Панятоўскага. Не маючы шырокай падтрымкі ў Рэчы Паспалітай, малады манарх не апусціў рукі і з дапамогай клана Чартарыйскіх пачаў рэформы ў розных сферах — эканоміцы, культуры, палітыцы, войску. Апаненты не марудзілі і ўзяліся за інтрыгі. Неўзабаве разгарнулася грамадзянская вайна, якая знясіліла краіну. Калі 5 верасня 1772 года на тэрыторыю Рэчы Паспалітай увайшлі арміі трох суседніх дзяржаў, то на яе абарону не было каму падымацца. Сейм 1773—1775-га ўхваліў падзел Рэчы Паспалітай, што стаў пралогам да завяршэння праекта “Вялікае Княства Літоўскае”. На гэтым — да пэўнага часу — актыўныя палітычнаваенныя дзеянні скончыліся. Наступіў адносны спакой, і кароль з колам аднадумцаў здолелі працягнуць стваральную работу. Перыпетыі ў краіне не маглі не паўплываць на Тэафілю. Тыя кавадла і молат умацоўвалі характар паэткі, фарміравалі яе як патрыётку.

КАРОЛЬ-КУЛЬТУРТРЭГЕР

Трэба сказаць колькі слоў пра культурны клімат, які істотна змяніўся ў часы Панятоўскага. Ён заснаваў першы публічны нацыянальны тэатр, распрацаваў і ўвёў цэлую сістэму дзяржаўных узнагарод, у якой адметнае месца займалі медалі для творчых асоб. Два разы на тыдзень пачаў выходзіць часопіс Monitor — неафіцыйны рупар каралеўскай партыі. Паўсталі першыя вялікалітоўскія газеты — Gazety Wileńskie ды Gazeta Grodzieńska (першае перыядычнае выданне на беларускіх землях). Штотыднёвік Zabawy Przyjemne i Pożyteczne (1770—1777) быў рэхам сустрэч каралеўскага клуба — так званых чацвярговых абедаў, на якіх збіраліся перадавыя людзі. У не надта доўгім спісе ўдзельнікаў першыя пазіцыі займалі і некаторыя выхадцы з ВКЛ — падканцлер вялікі літоўскі граф Яўхім Храптовіч (навагрудчанін і першы “піяршчык” творчасці нашай гераіні). У сядзібу Глінскіх і ў рукі Тэафілі мусілі трапляць аб'ёмны Pamiętnik Historyczno-Polityczny і штоквартальнік Magazyn Warszawski. У другім і адбыўся дэбют паэткі. Як і ўсе выданні, заснаваныя пры Панятоўскім, Magazyn Warszawski служыў прапагандзе ідэй Асветніцтва, шмат увагі ўдзяляў краявой і замежнай літаратуры, публікаваў творы і рэцэнзіі на кнігі.

Калі інтэрнэту не існавала, крыніцай інфармацыі быў друк. Часопіс Pamiętnik Historyczno-Polityczny вёў рэй сярод СМІ. Спектр тэм быў шырокі — усё самае новае са свету палітыкі, гісторыі, геаграфіі, эканомікі, навукі, медыцыны, літаратуры. Менавіта ў гэтым выданні ў майскім нумары 1783 года з'явілася дэталёвае апісанне маёнтка падканцлера ВКЛ графа Яўхіма Храптовіча ў Шчорсах. Праз год натхнёная артыкулам паэтка пабывала ў гасцях у Храптовіча і стварыла паэму “Шчорсы”. А яшчэ праз год работу надрукаваў Magazyn Warszawski. У ім жа пабачыў свет і вершаваны пераклад урыўка “Гімн перуанцаў пра смерць” з аповесці знакамітага французскага пісьменніка Жана-Франсуа Мармантэля “Інкі”.

А ДАЛЕЙ...

...мы раскажам пра тое, як і дзе Тэафіля Глінская пазнаёмілася са Станіславам Аўгустам Панятоўскім, пра яе шлюб з пляменнікам слыннага амбасадара Рэчы Паспалітай у Англіі ды пра іншыя цікавінкі з жыццяпісу творцы.

Зміцер ЮРКЕВІЧ
Фота аўтара

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Матэус Дайш, 1764

Штоквартальнік Magazyn Warszawski — выданне, у якім адбыўся літаратурны дэбют Тэафілі Глінскай

Ліст Яўхіма Храптовіча з біяграфіяй паэткі

У Смаргонскай раённай бібліятэцы з'явіўся новы бібліёбус.

Зямная ўпарадкаванасць космасу

Персанальная выстава Глеба Отчыка “Космас беларуса” працуе ў Сенатарскай зале Новага замка ў Гродне. Сэнсавая і выяўленчая дамінанта экспазіцыі — свежая серыя работ “Беларускі космас”.

Гэта яшчэ адзін знакавы праект у творчасці мастака, арыгінальны і актуальны. Аўтар своеасабліва працягвае касмічную тэму славутых папярэднікаў, чые думкі ўзносіліся над зямлёю. Марк Шагал лунаў у вышыні разам з бязважкімі закаханымі. Фантастычныя краявіды Марса, Месяца, Сатурна імкнуўся ўзнавіць на палотнах летуценнік Язэп Драздовіч. Фердынанд Рушчыц заніжаў у творах лінію гарызонту, каб паказаць усю магутнасць і прыгажосць неабдымных абшараў.

Космас — узор упарадкаванасці нябесных цел, міжзорнага рэчыва, промняў, цёмнай матэрыі. Усе гэтыя складнікі бясконцай загадкавай прасторы Глеб Отчык прадставіў у выразных вобразах, надаўшы кожнай выяве асобную экспрэсіўную афарбоўку.

Глядач стойвае дыханне перад жывапіснай інтэрпрэтацыяй, прыслухоўваецца да ўласнага ўспрымання кожнай кампазіцыі. Думаецца, што сонечнае абуджэнне Зямлі адбываецца менавіта над нашай краінай, а вогненнае свячэнне за цёмным дыскам Месяца кожны нібыта бачыў іменна над сваім домам. Згадваецца і аповед пра тое, як з вежы Фарнага касцёла сонечнае зацьменне назіраў у тэлескоп знакаміты еўрапейскі астраном — наш зямляк Марцін Пачобут-Адляніцкі.

Навукоўцы даследуюць зорнае неба пераважна ноччу. Можа, таму фоны ўсіх работ з цэнтральнай серыі цёмныя, аксамітна-глыбокія, з чарнатой, чырванню, сінявой? Гэта надае кампазіцыям загадкавую прыцягальнасць. А тонкае незямное святло ў творах выклікае лагічныя візуальныя асацыяцыі з хвалевымі выпраменьваннямі сонечнай энергіі.

Касмічныя з'явы блізкія і зразумелыя ўсім людзям, таму што наша існаванне непарыўна аб'яднана з нябеснымі працэсамі ў неабсяжнай бездані Сусвету. Ствараецца адчуванне, што кожны вобраз нясе свой падтэкст, які хутчэй чытаецца падсвядома і апелюе да нашай гістарычнай памяці, філасофскага асэнсавання існавання чалавека і прыроды. Пад вялізным бязмежным небам стагоддзямі плыве жыццё. Старадаўнія гарады руйнуюцца, узводзяцца новыя, пакаленні змяняюцца, нараджаюцца новыя людзі. І наша краіна, Беларусь, спрадвеку існуе на гэтым месцы планеты.

Шэраг работ Глеб Отчык прысвяціў жыццю зямному, імкнучыся падкрэсліць яго непарыўную повязь са сферамі нябеснымі. У першую чаргу гэтае гарманічнае спалучэнне адбываецца праз сакральныя вобразы, сутнасць якіх узыходзіць да першых хрысціянскіх знакавых кодаў. Напрыклад, палатно “Любоў. Час. Троіца” ўтрымлівае тры аднолькавыя малюнкі рыбы. Узмацняючы вобразны шэраг, аўтар уводзіць дадатковыя знакавыя дэталі: сэрца, пясочны гадзіннік, трыкутнік. У іншых творах тактоўна выкарыстоўваюцца матывы-архетыпы са старадаўніх абразоў. І ўжо зусім зямное апірышча — святланосны замак на фоне сіняга-сіняга неба. Наша планета яднаецца з высокім космасам і праз магутныя дрэвы, якія прачытваюцца як традыцыйныя сусветныя “дрэвы жыцця”.

Марына ЗАГІДУЛІНА

Чараўніцтва ў Вялікім

У нашай газеце і Telegram-канале “Культура і Мастацтва” працягваецца цыкл чайнвордаў і віктарын, якія мы ладзім сумесна з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Чарговыя пераможцы дзелацца ўражаннямі.

Тацяна, работніца завода медыцынскіх прэпаратаў:

— Я ўпершыню вырашыла паўдзельнічаць у віктарыне. Дзякуючы дапамозе сяброўкі, што працуе ў сферы культуры, стала пераможцай. Для мяне балет “Маленькі прынц” — цудоўная і добрая казка. Шыкоўныя касцюмы! Выбітная праца артыстаў! Асабліва спадабаўся Маленькі прынц. Цудоўнае музычнае суправаджэнне! Я зачаравана пастаноўкай. Спадзяюся, пашанцуе яшчэ раз, і я зноў завітаю ў Вялікі тэатр.

Аляксандр, супрацоўнік банка:

— У Вялікім тэатры бываў неаднойчы. Гэтым разам трапіў дзякуючы дачцэ Сафіі. Яна прынесла газету “Культура” з чайнвордам і сказала, што вельмі хоча на спектакль “Кармэн” у выкананні Маскоўскага дзяржаўнага акадэмічнага дзіцячага музычнага тэатра імя Наталіі Сац. Разгадаўшы галаваломку, мы з Сафіяй атрымалі магчымасць паглядзець самую папулярную оперу ў свеце. Выдатная пастаноўка, дэкарацыі. Дачку больш за ўсё ўразіла выканаўца ролі Кармэн, Наталля Зіміна. Выдатная праца! А колькі эмоцый! Гэта быў моцны і эфектны музычны спектакль пра каханне. Дзякуй газеце і тэатру!

Афіша з 8 па 15 лістапада

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава **“Плынь часу”**. Жывапісныя і скульптурныя творы беларускіх мастакоў — юбіляраў 2024 года. **Да 10 лістапада.**
- Выстава **“Сямён Дамарад. Краявіды радзімы”**. Каля 50 жывапісных твораў з майстэрні аўтара і фондаў музея. **Да 24 лістапада.**
- Выстава **“Чароўная тканіна прыроды Івана Дмухайлы”**, прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Івана Сямёнавіча Дмухайлы (1914—2007). **Да 8 снежня.**
- Экскурсіі: **“Самыя-самыя...” (6+)**, **“Якога колеру зіма?” (6+)**, **“Казкі Усходу” (10+)**, **“Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма” (10+)**, **“Партрэты даўнія мінулых пакаленняў...” (10+)**, **“Пяць моў кахання” (16+)**, **“Жаночы партрэт” (16+)**, **“Мінск у музеі” (16+)**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ “ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ.”
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Фотавыстава Валерыя Сібрыкава **“Запределье”**. **Да 5 лістапада.**
- Праграма **“Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы”**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Таямніцы старажытнай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Пошукі мінулага”**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Інтэр'ер шляхецкай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Шлях мастака Валенція Ваньковіча”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Сядзібны партрэт”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ
г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **“Зразумелае мастацтва”**. **Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА
Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца,
вул. Іванаўская, 17б,
тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Саломапляценне”**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Лялька-мотанка”**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Ткацтва”**. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

Вашы прапановы ды ідэі чакаем на e-mail: kim@kultura-info.by.

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Сцэнічны містэрыум у 2 дзеях **“Маленькія трагедыі” (16+)**. Прэм’ера. **8 лістапада ў 18.30.**
• Казка **“Як стаць супергероем?” (0+)**. Прэм’ера. **9 лістапада ў 12.00.**
• Крымінальная камедыя **“Хітрыкі Скапена” (16+)**. Прэм’ера. **9 лістапада ў 18.30.**
• Займальная казка для дзяцей і дарослых у 2 дзеях **“Чырвоная Шапачка” (6+)**. **10 лістапада ў 12.00.**
• Камедыя ў 1 дзеі **“Настаўленне для ахвотных ажаніцца” (16+)**. **10 лістапада ў 18.30.**
• Гісторыя прывязанасці ў 1 дзеі **“Прыйшоў мужчына да жанчыны” (18+)**. **12 лістапада ў 18.30.**
• Спектакль-канцэрт, заснаваны на падзеях з лістоў франтавіка, **“Просто ты умела ждать...” (12+)**. Прэм’ера. **13 лістапада ў 18.30.**
• Французская камедыя ў 2 дзеях **“Сем жанчын на шыі” (16+)**. **14 лістапада ў 18.30.**
• Prank comedy ў 2 дзеях **“Шалёныя грошы” (16+)**. **15 лістапада ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Трагікамедыя **“Апошні атракцыён” (16+)**. Галоўная сцэна. **8 лістапада ў 19.00.**
• Канцэрт у цемры **“Стыльнае пагружэнне — кантры-вайб” (18+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца па вул. Валгаградскай, 35. **8 лістапада ў 19.00.**
• Казка **“Гісторыя шакаладнага дрэва” (0+)**. Галоўная сцэна. **9 лістапада ў 17.00.**
• Трагіфарс **Donna sola (“Жанчына адна”) (18+)**. Камерная сцэна. **9 лістапада ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Рамантычны балет у 3 дзеях **“Эсмеральда” (12+)**. **8 лістапада ў 19.00.**
• Камічная опера ў 2 дзеях **“Севільскі цырульнік” (12+)**. **9 лістапада ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Жызэль” (12+)**. **10 лістапада ў 18.00.**
• Канцэрт **“Музыка Сяргея Рахманінава” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **10 лістапада ў 18.30.**
• Экскурсія **“Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі” (6+)**. **12 лістапада ў 15.30, 13 лістапада ў 15.30, 16 лістапада ў 14.00.**
• Опера ў 3 дзеях **“Самсон і Даліла” (12+)**. **12 лістапада ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Шчаўкунок” (6+)**. **13 лістапада ў 19.00, 15 лістапада ў 19.00.**
• Опера ў 3 дзеях **“Тоска” (12+)**. **14 лістапада ў 19.00.**
• Вечар скрыпічнай музыкі **“Скрыпак шмат не бывае” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **15 лістапада ў 19.30.**
• Опера ў 3 дзеях **“Лятучы галандзец” (12+)**. **16 лістапада ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Лебядзінае возера” (12+)**. **17 лістапада ў 18.00.**

УНП 191081322

Вялікі тэатр Беларусі
аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па творчых спецыяльнасцях:
— артыст балета,
— артыст балета (саліст).

Дадатковая інфармацыя — на сайце **bolshoibelarus.by**.
220029, г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1.

УНП 191081322

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “НЯСВІЖ”

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Тэатралізаваная экскурсія **“Гісторыя адной каралевы”**. **9—10 лістапада з 12.00.**
• Часовая экспазіцыя **“Пакт Рэрыха — Мір праз Культуру”**. Вялікая выставачная зала. **Да 15 лістапада.**
• Экспазіцыя **“Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені”**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Выстава **“Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі”**. Калекцыйныя залы “Слуцкія паясы”. **Да 31 снежня.**
• Міжнародны выставачны праект **“Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара”**. **У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **“Палацавыя таямніцы”**.
• Віртуальныя выставы: **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”**, **“Нясвіж — здабытак сусветнай культуры”**, **“Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа”**, **“Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»”**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Экспазіцыя твораў Наталлі Гузняк **“...Я так бачу”**. **Да 15 студзеня 2025 года.**

Ратуша
Пастаянныя экспазіцыі
• **“Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.”.**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **“Культура часу”**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **“Безаблічны артэфакт”**, **“Карта сямі каралеўстваў”**, **“Музейны дэтэктыў”**, **“Музейнае расследаванне”**.
• Культурныя мерапрыемствы: **“Прыём у княгіні”**, **“Дзень нараджэння ў ратушы”** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **“Школа шпіёнаў”** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **“Музейка аб музеі”** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **“Выкрунтасы”** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Экспазіцыя **“Арсенал: ваенная зброя ў гістарычным кантэксце”**. Сумесны праект з Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Паўночны корпус. **Да 22 кастрычніка 2025 года.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Экспазіцыя **“Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку”**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **“Інтрыгі Купідона”**.
• Сямейная квэст-экскурсія **“Легенды і паданні Мірскага замка”**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **“Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце”**, **“Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.”**, **“Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.”**, **“Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў”**.

УНП 590201541

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **“Музей, якому служыш”**, прысвечаная 80-годдзю ўстановы.
• Часовая экспазіцыя **“Адзінай памяці верныя”**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.
• Часовая экспазіцыя **“Музей. Час. Памяць”**, створаная ў рамках праекта “Адкрытыя фонды”.
• У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне экспазіцыі музея.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Персанальная выстава Надзеі Сёнмез **“Твары. Рэха пачуццяў”**. **Да 10 лістапада.**
• **Выстава пераможцаў Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва ў 2023 годзе. Да 15 снежня.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **“Рэха мадэрнізму. Ад Манэ да Кандзінскага”**. **Да 19 студзеня 2025 года.**

УНП 192543414

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР “ЛЯЛЬКА”

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Зусім верагоднае здарэнне ў 2 дзеях **“Яшчэ раз пра Чырвоную Шапачку” (3+)**. Глядзельная зала. **9 лістапада ў 11.00.**
• Інтэрактыўны спектакль **“Падарожжа ў Мумі-даліну” (2+)** ад тэатра лялек “Ухтышка”, Віцебск. Фае тэатра. **9 лістапада ў 17.00.**
• Інтэрактыўны спектакль **“Дзіўныя прыгоды мышаняці” (2+)** ад тэатра лялек “Ухтышка”, Віцебск. Фае тэатра. **10 лістапада ў 10.30.**
• Кранальная гісторыя без слоў у 1 дзеі **“Дзюймовачка” (3+)**. Глядзельная зала. **10 лістапада ў 12.00.**

УНП 300001869

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.

УНП 100377771

Арганізацыя запрашае на працу рэдактара інтэрнэт-рэсурсу (у абавязкі ўваходзіць і вядзенне сацыяльных сетак). Заработная плата — па выніках сумоўя. Рэзюмэ высылаць на адрас электроннай пошты: **kultura.bel@yandex.by.**

t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад “Культуры”! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАЎРЫШ, Данііл ШЭЙКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.

Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).

Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на пр-це Незалежнасці, 48, і Пераможцаў, 5, на вул. Лабанка, 2, Валадарскага, 16, Няміга, 30, Леніна, 18, Максіма Багдановіча (ля прыпынку "Ст. м. «Няміга»"), у падземных пераходах на плошчы Перамогі і станцыі метро "Пятроўшчына".

Падпісана ў друк 06.11.2024 у 16.00. Замова № 2559. Наклад 3463.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.

Рознічны кошт — па дамоўленасці.
* — матэрыял на правах рэкламы.